# Беларуская мова

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

**I КЛАС**
**Кантрольнае спісванне** (15–20 слоў)

**Вясной**

Наступіла вясна. Яна прынесла цяпло і святло. У лесе можна знайсці першыя грыбы. Гэта смарчкі. (16 слоў)

**Салаўі**

Аленка любіць птушак. Яна запісвае на тэлефон іх галасы. У кожнай птушкі свая песня. У маі прыгожа спяваюць салаўі! (20 слоў)

**Настаўнік**

Васілёк дастаў цацкі са скрыні. Сёння ён настаўнік. Хлопчык расказаў зайчанятам правілы дарожнага руху. Іх трэба ведаць і выконваць! (20 слоў)

*(Паводле В. Гурскага)*

**II КЛАС**
**Дыктанты** (35–40 слоў)

**Калыска**

Калыска — дзіцячы ложак. Раней рабілі яе з дошак і драўляных рэек. Плялі яшчэ з дубцоў лазы і ракіты. Падвешвалі калыску да столі ці да жэрдкі. Рабілі калыскі і на ножках. Маці ставіла такую калыску каля свайго ложка. (39 слоў)

*(Паводле М. Маляўкі)*

*Паведаміць пра пастаноўку працяжніка ў першым сказе.*

**Лотаць**

Наступіла вясна. Прыгрэла сонца. Растае снег. Вада залівае лагчыны і балоты. Тут можна палюбавацца залацістымі кветкамі лотаці. Яна цвіце ў вільготных мясцінах да двух тыдняў. Вада спадае. Наваколле падсыхае. Кветкі нікнуць і знікаюць. (34 слова)

*(Паводле В. Кажуры, А. Прохаравай)*

*Запісаць на дошцы словы:* лагчыны, падсыхае.

**У вёску**

У суботу тата з мамай сабраліся ў вёску. Надзя і Паўлік паехалі з імі. Колькі радасці ў дзяцей! Не адарваць было ад акон аўтобуса. На станцыі іх сустракалі бабуля і дзядуля. Яны былі рады ўбачыць унукаў. (38 слоў)

*(Паводле В. Гурскага)*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

**II КЛАС**
**Дыктанты** (25–30 слоў)

**Азёры**

Нашу Радзіму называюць краінай блакітных азёр. Іх у нас тысячы. Многа гэта ці мала? Зірніце на карту роднай Беларусі. Вы ўбачыце мноства блакітных плям. Гэта і ёсць азёры! (29 слоў)

*(Паводле В. Кажуры)*

*Паведаміць пра напісанне слова* тысячы.

**Птушкі**

У Белавежскай пушчы можна ўбачыць розных птушак. Прыгожа спявае салавей! Гівал* залівaецца ў свісток з вадой. Цецярук балбоча. Шпак пераймае галасы іншых птушак. Сава вухкае. Чорны бусел маўчыць. (29 слоў)

*(Паводле У. Караткевіча)*

* *Гівал — івалга.*

**Лён**

Лён вырошчваюць на нашых землях з даўніх часоў. Ён стаў сапраўдным нацыянальным здабыткам нашай краіны. З ільну шыюць якасную вопратку. З яго рыхтуюць лекі. Насенне лёну дабаўляюць у стравы. (30 слоў)

*(Па матэрыялах кнігі “Мая Радзіма — Беларусь: азбука сімвалаў краіны для дзяцей”)*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАМІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

**III КЛАС**
**Дыктанты з дадатковым заданнем**

**Нарач**

Возера Нарач — жамчужына Беларусі. Чыстае неба адлюстроўваецца ў яго празрыстай вадзе. Сонца цэлымі днямі пазірае ў нарачанскае люстра.

Начамі любуюцца ў ім на сябе зоркі. Бераг возера вартуюць сосны.

Майскімі днямі каля Нарачы кукуюць зязюлі. Шмат каля возера салаўёў. Любяць яны спяваць у маі! (46 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

*Паведаміць пра пастаноўку працяжніка ў першым сказе.*

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвае слова да прапанаванага слова. Абазначце ў словах корань.
   *І варыянт:* Нарач.
   *ІІ варыянт:* варта.
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго лік і час.
   *І варыянт:* Начамі любуюцца ў ім на сябе зоркі.
   *ІІ варыянт:* Майскімі днямі каля Нарачы кукуюць зязюлі.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *І варыянт:* Сонца цэлымі днямі пазірае ў нарачанскае люстра.
   *ІІ варыянт:* Чыстае неба адлюстроўваецца ў яго празрыстай вадзе.

**Вязынка**

Янку Купалу называюць сонцам беларускай паэзіі. Ён стаў паэтам сусветнай велічыні. Нарадзіўся Янка Купала ў вёсцы Вязынка. Гэты куток ведаюць далёка за межамі нашай старонкі. Сюды ў любую пару года прыязджаюць людзі. Яны любуюцца прыгожымі краявідамі ў ваколіцах Вязынкі. Людзі абавязкова наведваюць музей. Яны аглядаюць помнік паэту. (48 слоў)

*(Паводле М. Чарняўскага)*

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, супрацьлеглыя па значэнні да прапанаваных слоў.
   *І варыянт:* блізка — __________, брыдкімі — __________.
   *ІІ варыянт:* туды — __________, ад'язджаюць — __________.
2. Разбярыце словы па саставе.
   *І варыянт:* беларускай.
   *ІІ варыянт:* сусветнай.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *І варыянт:* Людзі абавязкова наведваюць музей.
   *ІІ варыянт:* Сюды ў любую пару года прыязджаюць людзі.

**У парку**

Наступіла лета. Да Машы ў госці прыехаў з вёскі дзядуля. Разам яны хадзілі ў парк. Там бачылі варон і вераб'ёў. Дзед з Машай пагушкаліся на арэлях. Потым пагулялі ў квача і хованкі. Дома дзяўчынка расказала маме пра парк. Дзед слухаў і толькі ўсміхаўся. (45 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, супрацьлеглыя па значэнні да прапанаваных слоў.
   *І варыянт:* паасобку — __________, ад'ехаў — __________.
   *ІІ варыянт:* зіма — __________, горада — __________.
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і род.
   *І варыянт:* Да Машы ў госці прыехаў з вёскі дзядуля.
   *ІІ варыянт:* Дома дзяўчынка расказала маме пра парк.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *І варыянт:* Дома дзяўчынка расказала маме пра парк.
   *ІІ варыянт:* Да Машы ў госці прыехаў з вёскі дзядуля.

**IV КЛАС**

**Дыктанты з дадатковым заданнем**

**Возера Нарач**

Возера Нарач самае вялікае ў Беларусі. Вада ў Нарачы празрыстая. Тут жывуць плоткі, акуні, шчупакі і нават вугры. Зімой праз лёд на Нарачы можнаназіраць за рыбамі. Калі неба чыстае, то вада ў возеры блакітная. Калі хмары на небе, Нарач становіцца сярдзітай. Пачынаюць шумець хвалі з белымі грабянямі. Над вадой трывожна крычаць чайкі.

Прыязджайце на Нарач! Вы палюбіце гэта возера на ўсё жыццё! (65 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

*Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказах:* Калі неба чыстае, то вада ў возеры блакітная. Калі хмары на небе, Нарач становіцца сярдзітай.

***Дадатковае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.
   *І варыянт:* нельга — __________, чорнымі — __________.
   *ІІ варыянт:* спакойна — __________, маленькае — __________.
2. Разбярыце словы па саставе.
   *І варыянт:* блакітная.
   *ІІ варыянт:* чыстае.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *І варыянт:* Над вадой трывожна крычаць чайкі.

*II варыянт:* Вы палюбіце гэта возера на ўсё жыццё!

**Хлеб**

Хлеб пануе над усім. Гэта галоўная наша ежа. Ён пераходзіць з веку ў век, не прыядаецца.

Як выпякалі хлеб раней? Чорны хлеб звычайна пяклі з жытняй мукі. Гаспадыня брала цеста з дзяжы, выкачвала круглыя боханы. На драўлянай лапаце саджала іх у печ. Пад боханы гаспадыня падкладвала кляновае ці дубовае лісце. Так хлеб прыгожа глядзеўся. Скарынка знізу не падгарала, не крышылася. Атрымліваўся смачны і духмяны хлеб! (66 слоў)

*(Паводле М. Маляўкі)*

*Запісаць на дошцы слова* знізу.

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту сінонімы да прапанаваных слоў.
   *I варыянт:* яда, ______________; асноўная, ___________; асноўная, ______.
   *II варыянт:* калісьці, ________; уладарыць, ________; пахучы, ________.
2. Знайдзіце ў сказе прыметнік, вызначце яго лік і склон.
   *I варыянт:* Гаспадыня брала цеста з дзяжы, выкачвала круглыя боханы.
   *II варыянт:* На драўлянай лапаце саджала іх у печ.
3. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.
   *I варыянт:* Гаспадыня брала цеста з дзяжы, выкачвала круглыя боханы.
   *II варыянт:* Скарынка знізу не падгарала, не крышылася.

**Качкі**

Быў сонечны дзень. Таццяна разам з дзядулем прагульваліся ў парку. Дзяўчынка спынілася на мосціку праз рэчку. Таня пачала ўважліва назіраць за шэрымі птушкамі. Яны сядзелі на вадзе, спакойна гайдаліся на хвалях. Гэта былі качкі. Раптам адна з іх нырнула. Толькі доўга наверсе тырчаў яе хвост. За ёй пачалі ныраць астатнія качкі. Што яны робяць? Так птушкі здабывалі сабе абед! Ніхто не падасць ім на талерцы ежы! (67 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

*Запісаць на дошцы словы:* наверсе, ніхто.

***Дадатковае заданне***

1. Разбярыце слова па саставе.
   *I варыянт:* мосцік.
   *II варыянт:* дзядуля.
2. Вызначце лік, асобу і склон займенніка ў сказе.
   *I варыянт:* Толькі доўга наверсе тырчаў яе хвост.
   *II варыянт:* За ёй пачалі ныраць астатнія качкі.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Дзяўчынка спынілася на мосціку праз рэчку.
   *II варыянт:* Толькі доўга наверсе тырчаў яе хвост.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Гурскі, В. Р. Кучараўчык : апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Р. Гурскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 159 с.
2. Кажура, В. Дзеткі і кветкі / В. Кажура, А. Прохарава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2021. — № 2. — С. 69–71.
3. Кажура, В. В. Маленькая азбука вялікай краіны : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / В. В. Кажура. — Мінск : Пачатковая школа. — 2019. — 36 с.
4. Караткевіч, У. С. Белавежская пушча : нарыс : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 16 с.
5. Ліпскі, У. С. Я тут жыву: дзецям пра Беларусь / У. С. Ліпскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2008. —128 с.
6. Ліпскі, У. С. Сакрэты колераў вясёлкі : апавяданні, казкі, вершы / У. С. Ліпскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. — 120 с.
7. Маляўка, М. А. Сядзіба, або Хата з матчынай душою : абразкі, вершы : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. А. Маляўка. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 143 с.
8. Мая Радзіма — Беларусь: азбука сімвалаў краіны для дзяцей : для дашк. і мал. шк. узросту / Л. У. Манкевіч. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2016. — 31 с.
9. Чарняўскі, М. М. З думкай пра Беларусь, альбо Ёсць дзіва, адвечнае дзіва... : апавяданні, вершы, загадкі : для дзяцей сярэд. шк. узросту / М. М. Чарняўскі. — Мінск : Народная асвета, 2015. — 119 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт